УДК 911.373

Кулініч І. В.

# ТАПАНІМІКА І МІКРАТАПАНІМІКА МЯСЦОВАСЦІ ВЁСАК ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА

*Навуковы кіраўнік: Міцкевіч К. М., ст. выкладчык*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**

У спадчыну ад мінулых пакаленняў нам дасталася вялікая колькасць назваў населеных пунктаў, рэк і азёр, палёў і сенажацяў, урочышчаў і іншых геаграфічных назваў. На зямлі нашай Бацькаўшчыны, бадай, не знойдзеш ніводнай народнай назвы, якая б узнікла выпадкова, без дай прычыны. Калі ўважліва прыгледзецца, дык заўсёды вызначыш, што вынікае яна з нейкіх асаблівасцей прыроднага асяроддзя, умоў вытворчай дзейнасці жыхароў і вельмі часта звязана з гістарычным мінулым чалавека. Сам народ ніколі не назаве свае паселішча словам, якое ў чымсьці не адпавядала б, а тым больш пярэчыла б, ісціне.

**Ключавыя словы**: тапонімы, мікратапонімы, вёска, урочышча, мясцовасць

Kulinich I. V.

# TOPONYMICS AND MICROTOPONYMICS OF LOCAL VILLAGES OF IVACEVITSK DISTRICT

*Scientific Supervisor: Mitskevich K. M., Senior Lecturer*
*Belarusian National Technical University*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**

We inherited a large number of names of settlements, rivers and lakes, fields and hayfields, tracts and other geographical names as an inheritance from past generations. On the land of our Motherland, perhaps, you will not find a single folk name that arose by chance, without any reason. If

you look carefully, you will always determine that it results from some features of the natural environment, the conditions of production activity of the inhabitants, and very often it is connected with the historical past of man. The people themselves will never call their settlements a word that would not correspond to something, and even more so would contradict the truth.

**Keywords**: toponyms, microtoponyms, village, natural boundary, locality

## 1. Тапонімы і назвы навакольных вёсак

У аснове нашай любові да радзімы ляжаць многія фактары. І сярод іх, несумненна, найважнейшае месца займае наша прыхльнасць да засвоеных яшчэ з дзяціства назваў блізкіх мясцін: вёсак і гарадоў, рэк і азёр, палёў і лугоў. Такія назвы ў навуковай літаратуры называюцца тапонімамі (ад грэч. topos – мясцовасць, onoma – імя). Лексічны склад беларускай тапанііі шырока адлюстроўвае назвы прыродных і штучных вадаёмаў (Азярцо, Рэчкі, Крыніцы), балот (Дрыгва, Тапелец), узвышшаў (Бугры, Грудок), мясцін з роўнай паверхняй (Плоскія, Яснішча), назвы глебы паводле прыродных якасцей (Пяскі, Гліншча), раслінасці (Дубрава, Вялікая Лаза), жывёл, птушак (Сабачы Грудок). Лексічную аснову тапонімаў утвараюць не толью агульныя словы, а і ўласныя імёны (Сёмкава Балота, Жукава, Юздрыкі).

Тапаграфічнае імя амаль ніколі не бывае выпадковым і пазбаўленым значэння. У ім па большай частцы выяўляюцца ці якая-небудзь прыкмета ўрочышча, ці характэрная рыса мясцовасці, ці намёк на паходжанне прадмета, ці нарэшце якая-небудзь акалічнасць, больш-меньш цікавая для розуму альбо фантазіі. Тапонімы ўзнікаюць у канкрэтных гістарычных умовах і адлюстроўваюць розныя бакі жыцця і дзейнасці людзей (сувязь з прыродай, побыт, характар сельскай гаспадаркі, промыслаў, вытворчасці). Можна сказаць, што старажытны тапонім – гэта проста знаходка ў імкненні выявіць пераемнасць паміж далёкім мінулым і сённяшнім днём, гісторыяй і сучаснасцю.

У нашай працы мы паспрабуем даследаваць паходжанне некаторых тапонімаў, якія бытуюць у раёне вёсак Падстарынскага сельскага Савета: Азярцо, Сенькавічы, Боркі, Халап'я. Найперш аб назве кожнай з вёсак, таму што менавіта ў іх увасоблены геаграфічныя і прыродна-кліматычныя асаблівасці роднага краю, характар вытворча-прафесійнай дзейнасці людзей, спосабы і формы задавальнення імі сваіх матэрыяльных патрэб. Нашы продкі ахвотна выкарыстоўвалі асаблівасці мясцовага ландшафту ў назвах населеных пунктаў.

Самай старажытнай з пералічаных з'яуляецца веска Боркі. Паводле даследаванняў, паселішча існавала ўжо ў 13–15 стагоддзях. Пісьмовыя крыніцы ўжо ў 1420 годзе засведчылі тут сялянскія хваляванні, якія былі жорстка падаўлены. Наступнае пісьмовае ўпамінанне вёскі Боркі датуецца 7 сакавіка 1576 года і надалей звязана з буйным магнацкім родам Сапегаў. Праводзячы абмер Слонімскага лясніцтва, Дзмітрый Фёдаравіч Сапега моцна прастудзіўся і памёр у Борках. З 1870 года – гэта цэнтр Боркінскай воласці Слонімскага павета Гродзенскай губерні. Назва вёскі паходзіць ад назвы невялікіх лясоў, якія часта ў нас называюць баркамі. І па сённяшні дзень такія баркі акружаюць вёску. Пра паходжанне гэтай назвы ёсць такая легенда. Па рацэ на лодках плылі людзі. Убачылі на высокім узгорку баравы меднастволы хвойнік, заліты сонечным святлом. Супыніліся ўражаныя, узрушаныя гэткай красой. Доўга не раздумвалі, а вырашылі жыць тут. Высокія пясчаныя ўзгоркі, парослыя сасной, пакідалі як непрыгодныя для сяўбы. Так і засталіся з тых часоў сярод поля ўзгоркі – баркі. Адгэтуль і пайшла назва паселішча – Боркі. Населеных пунктаў з такой ці падобнай назвай на тэрыторыі Беларусі сустракаецца вельмі шмат.

Пра паходжанне назвы вёскі Сенькавічы існуе некалькі легенд. Адна з іх апавядае, што ў густых лясах, якімі некалі было акружана паселішча, гаспадарыў са сваімі разбойнікамі Сенька-атаман. Рабаваў Сенька багатых людзей і дзяліўся з беднымі. Вельмі ж любілі яго за гэта ў народзе, таму і вёску яго імем назвалі. Другая легенда расказвае аб тым, як пасяліўся на рэчцы Грыўда каля Раўца малады рыбак (Раўцом называюць месца на рэчцы, дзе камень вялкі ляжыць. Вада б'ецца аб камень, аж раве). Жыў тут сабе малады рыбак сам па

сабе, і смутна стала чалавеку. Прыгледзеў прыгажуню-дзяўчыну і пасяліў яе ў хаце, якую збудаваў на горцы, дзе рос магутны дуб. Да гэтай сям’і далучыліся іншыя, а паселішча, якое ўзнікла, пачалі называць па імені Сенькі Сенькавічамі. Першае пісьмовае ўпамінанне вёскі Сенькавічы датуецца 14 снежня 1557 года. У гэты дзень Ганна Сухадольская робіць дарчы запісу кнігу Слонімскага земскага суда, у якім перадае ў поўнае карыстанне "молжонку своему Яну Суходольскому, узнаваючи его ку собе зычливую приязнь...дворец Сеньковский". Першыя пасяленцы аблюбавалі гэтае месца яшчэ ў сівой дауніне. Курганны могільнік, які знаходзіцца на тэрыторыі вёскі, (мясцовая назва Шведскія капцы) адносіцца да 11–12 стагоддзя. Так вызначылі вучоныя-археолагі, праводзячы раскопкі.

Невялікая вёска Азярцо размешчана ўсяго за чатыры кіламетры ад горада Івацэвічы. Несумненна, што ў вёскі даўняя гісторыя, але ўпершыню яна згадваецца 6 мая 1698 года, калі ўдава ваяводы віленскага і гетмана ВКЛ Паўла Яна Сапегі Ганна з Копцяў уласнаручным запісам даруе ўніяцкай царкве ў Борках дзве валокі зямліў вёсцы Азярцо з правам уезда да пушчы і карыстаннем язамі на рэчцы Грыўда. Зрабіла яна гэта ў знак памяці аб цудадзейнай іконе Беззаганнага зачацця Найсвяцейшай Багародзіцы, якую знайшлі на сасне ў недалёкім лесе 24 чэрвеня 1670 года. Старыя людзі расказваюць, што веска падзяляецца як бы на тры часткі: Баяры, Асяродкі, Сяло. У той частцы, якая носіць назву Баяры, і сяліліся раней баяры ці багатыя людзі. Сялянам жа дазвалялі сяліцца толькі на другім канцы вёскі – у Сяле. Пазней з сялян таксама пачалі выдзяляцца багацейшыя, так званыя асяродкі, якія і сяліліся бліжэй да баяраў і, такім чынам, займалі прамежкавае (асяродкавае) значэнне як па сваім сацыяльным становішчы, так і па тэрыторыі пражывання. Так і замацаваліся гэтыя назвы па сённяшні дзень. На тэрыторыі Беларусі, як азёрнай краіне, засталося і існуе шмат тапонімаў, асновай для якіх паслужыў апелятыў возера ў розных лексічных яго значэннях і формах. Яшчэ ў пачатку 20 стагоддзя вёска мела розныя назвы: Азярэц, Азярцы, апошняя назва – Азярцо.

Веска Халап'я таксама размешчана на адным з высокіх маляўнічых пагоркаў, што спускаюцца да ракі Грыўды. На другім беразе гэтай ракі знаходзіцца горад Івацэвічы, у якім на пачатку 16

стагоддзя, паводле архіўных крыніц, знаходзіўся двор (сядзіба) знатнага роду Іллінічаў. Многія думаюць, што ў вёсцы Халап'я жылі так званыя халопы, асабіста залежная ад феадалаў і найбольш эксплуатуемая частка насельніцтва Расіі да пачатку 18 стагоддзя. Але вядома, што ў сярэднявеччы нашы землі ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага і ніякіх халопаў у гэтай дзяржаве не існавала. Назва ж вёскі паходзіць ад наймення сялян у Вялім княстве Літоўскім, якія абслугоўвалі панскі двор, выконвалі ўсе адміністрацыйныя, гаспадарчыя паслугі пану ад цівуноў да кухараў і называліся халупнікамі. Маёмасць халупнікаў складалася з невялікага надзела ворнай зямлі, сенажаці, агарода і хаты (халупы). Адсюль і назва пасялення. У ВКЛ халупнікі не адраблялі паншчыны іне плацілі аброку, але штогод плацілі феадалу, на зямлі якога жылі, так званыя паседзінкі ( 2-4 злотыя ў год). Малазямельныя халупнікі ў 17 стагоддзі зліліся з цяглымі сялянамі. У 1905 годзе веска Халап'я адміністрацыйна знаходзілася ў Боркінскай воласці Слонімскага павета. Газета "Наша ніва" у нумары за 14 сакавіка 1908 года паведамляла, што тут працуе школа, у якую "...прыслалі новую вучыцельку, маладую і добра вучоную паненку. Яна шчыра ўзялася за работу, каб пашырыць свет у народзе...". На жаль, прозвішча настаўніцы не паведамлялася.

## 2. Аб паходжанні некаторых мікратапонімаў

Адным з раздзелаў тапанімікі з'яуляецца мікратапаніміка. Гэта навука, якая займаецца вывучэннем назваў палёў, лясоў, лугоў, балот, сенажацей, дарог, пашаў, ручаёў і іншых дробных геаграфічных аб'ектаў.

Дапытлівы розум, багатая фантазія жыхароў многіх населеных пунктаў данеслі цяперашнім пакаленням шмат захапляючых версій пра іх паходжанне. Шматлікія дробныя геаграфічныя аб'екты называюцца адным тэрмінам -урочышча. Урочышча абавязкова адрозніваецца ад навакольнай мясцовасці якімі -небудзь прыкметамі.

Назвы ўрочышчаў цесна звязаны з жыццём і дзейнасцю людзей, занятых працаю ў сельскай гаспадарцы. Мікратапонімы прыдумваюць людзі, і яны служаць людзям. Людзі паклапаціліся, каб назваць кожнае ўрочышча і нават кожную сцяжынку сваей мясцовасці. Калі б людзі не прыдумалі назваў да сваіх урочышчаў,

то не ведалі б, куды ісці, як арыентавацца ў навакольным свеце. На Беларусі каля 31 тысячы населеных пунктаў, і вакол кожнага з іх мноства дробных геаграфічных аб'ектаў са сваімі імёнамі. Вакол кожнай вёскі налічваецца прыкладна каля 100 мікратапонімаў. Старэйшыя людзі ведаюць іх усе, людзі сярэдняга ўзросту – каля трыццаці-сарака, а маладыя – пяць-шэсць. Колькі ж іх ведаем мы?

У ходзе нашага даследавання былі разгледжаны найбольш распаўсюджаныя мясцовыя назвы. Напрыклад, цэлую частку вёскі Падстарынь называюць Юздрыкамі. Чаму? Як высветлілася, гэтая назва паходзіць ад прозвішча чалавека, які раней тут жыў і вызначаўся даволі задзірыстым, неўтаймоўным характарам. Так сталі называць не толькі іншых сварлівых людзей, але і месца, дзе яны жылі.

Вельмі распаўсюджанымі з'яуляюцца назвы невялікіх прыродных вадаёмаў: Баравы мох, Кудраўскі мох, Грушка, Гарбач, Тапелец, Дубрава. Аб паходжанні кожнай з іх можна расказаць цікавую гісторыю. Напрыклад, гісторыя назвы сажалкі Гарбач звязана з яе месцаразмяшчэннем. Знаходзіцца яна сярод узгорка, нібы ў чашы. Такім чынам, берагі сажалкі нагадваюць сабой гарбы жывёлы.

З назвай сажалкі Тапелец звязана такая легенда. Ехала дзеўка на валах з поля, не ўмела добра ім упраўляць. Зайшлі валы ў невялікае, але велымі глыбокае балотца і загразлі. Пабегла дзеўка за дапамогай у вёску. Пакуль прыбеглі людзі, валы ўжо затанулі. Таму і сталі называць месца гэтае Тапелец ці Тапілец.

Усе гэтыя прыродныя вадаёмы звязаны паміж сабой сістэмай падземных вод, якія выходзяць з падземнага возера, размешчанага ў лясным масіве Дубрава. Назву сваю гэта возера атрымала ад вялікай колькасці дубоў, што раслі і па сённяшні час растуць каля яго. Вясной і восенню, часам у даждлівае лета можна прасачыць на паверхні зямлі вільготную сцежку, што бяжыць ад аднаго вадаёма да другога.

Цікавыя звесткі пра паходжанне мікратапоніма Дрэліна некалі паведаміў былы настаўнік Прыступчык Сцяпан Кандрацьевіч: "Першыя пасяленцы нашай вёскі займаліся земляробствам. Спачатку яны асвойвалі ўзгоркавыя места, сеялі розныя культуры. Але з павелічэннем колькасці людзей усем места не хватало. Прыходзілася займаць нізкія места, якія часто залівала вадой. І людзі ваявалі з

вадой, спасаючы ураджай. А для гэтага ўжывалі прыспасабленне дрэль. (Ёсць факты, што гэта прыспасабленне на нашы землі прынеслі фіны, якія таксама бароліся з частымі навадненнямі). Гэтым прыспасабленнем свярлілі ямы, у якія сцякала вада, а ужо з іх яна быстро ўсасывалася ў зямлю. Рабілі такую дрэль з дошак, унізе было жалезнае лязо і невялікае кальцо. Кальцо круцілі, і лязо лезло ў землю. Так можна было быстро капаць ямы, у якіх прападала вада. Людзі былі давольны сваей работай, і прыспасабленне гэта прыжылося у нашых землякоў, як і слова, што яго называла. А церыторыю, дзе прымянялі гэту прыладу, сталі называць Дрэлінай. Цяпер, калі паявілася цехніка, сталі капаць канавы, дрэлі сталі не патрэбны".

Лясное ўрочышча Пожар назаўсёды ў сваей назве захавала памяць пра страшны пажар, які адбыўся тут і знішчыў многа дрэў.

Ялінай называлі змрочны стары хваёвы лес, які рос за вёскай. У гады вайны немцы высеклі гэты лес, але і па сённяшні дзень месца, дзе ён рос, называюць Ялінай.

Многа мікратапонімаў сустракаецца і сярод назваў палеткаў. Кут, Вугал, Круглыя боркі, Плоскія, Шнуркі, Яснішча, Пнёўе, Жукова, Мотрыкаў куток, Гай.

І кожная назва мае сваю гісторыю. Плоскім, напрыклад, называюць вельмі вялікае роўнае поле без узгоркаў.

Пнёўем назвалі поле, якое доўга не маглі ачысціць ад пнёў. І не адзін ужо ўраджай сабралі з яго, а пніўсё яшчэ сустракаюцца тут і цяпер.

Адзін з самых вялікіх сёння палеткаў раней быў падзелены на доўгія вузкія палоскі, якія вельмі ж ужо нагадвалі шнуркі. Дасціпная назва замацавалася і па сучасны дзень – Шнуркі.

Там, дзе цяпер знаходзіцца ўрочышча Гай стаяла некалі царква сярод негустых заraснікаў, якія часта называюць у той мясцовасці гайкамі. Спалілі царкву ў часы антырэлігійнай барацьбы, высеклі гай, а вось народная памяць захавала і такую старонку гісторыі. Сёння вернікамі на месцы былой царквы пастаўлены крыж, часам там адбываюцца царкоўныя службы.

Думаецца, што ўжо на гэтых прыкладах нам удалося пераканальна даказаць: мікратапанімічныя назвы – гэта россыпы народнай мудрасці, творчасць народнага генія, вытокі тонкіх назіранняў чалавека за навакольнай прыродай.

## Заключэнне

Праводзячы даследчую работу, мы ўпэўніліся, што кожны прыродны аб'ект у народнай мікратапаніміцы мае не толью сваю назву, але і гісторыю паходжання. Трэба толькі не ленавацца вывучаць сваю мясцовасць, і тады кожная сцежка, палянка, кожны ручаёк стануць для нас не проста сцежкай ці палянкай, але і нечым родным, блізкім, што прыадкрывае завесу даўняга, расказвае аб жыцці нашых прашчураў, узроўні іх культурнага развіцця. Любоў да роднага краю, сваёй зямлі ўвасабляецца і ў родных назвах. Пазнаць і вывучыць назвы сваей мясцовасці – значыць яшчэ больш палюбць сваю Бацькаўшчыну, яе людзей, яе прыроду, мову народа і яго гісторыю.

Гэта работа праводзілася на працягу толькі некалькіх месяцаў. Мы выкарыстоўвали звесткі, аб якіх паведамілі некалі жыхары вёскі Падстарынь Болтачка Васіль Юльянавіч, былы настаўнік Падстарынскай СШ Прыступчык Сцяпан Кандрацьевіч; сустракаліся з мясцовымі старажыламі Пытляк Кацярынай Цімафееўнай, Прыступчык Марыяй Васільеўнай; наведвалі ўзгаданыя аб'екты. Не ўсе з іх яшчэ вывучаны, але ўсе гэта нас вельмі зацікавіла, і мы спадзяемся на тое, што праз некаторы час будзем ведаць намнога больш. Бо жыць у ваколіцах мясцовасці, пра якую ведаеш шмат цікавага, ведаеш паходжанне назвы кожнай сцежкі, кожнай вуліцы або сажалкі - ужо сімвалічна. Тады пачынаеш адчуваць і сваю повязь, з тымі, хто жыў да цябе, і гонар за сваіх таленавітых прашчураў, і хочацца быць не горшымі за іх. А займацца даследчай дзейнасцю яшчэ і вельмі цікава!

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Падстарынскі сельскі Савет // Занальны дзяржаўны архіў у г. Баранавічы. Ф. 1141. Адз. хр. 1-24.
2. Падстарынскі сельскі Савет // Занальны дзяржаўны архіў у г. Баранавічы. Ф. 1095. Адз. хр. 1-581.